Соркіна І. Святочная культура мястэчак Беларусі // ARCHE. – 2011. – № 7-8. – С.112 – 137.

**Іна Соркіна** – гісторык, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Працуе ў Гарадзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы. Навуковыя інтарэсы звязаныя з гістарычнай урбаністыкай. Даследуе гісторыю мястэчак Беларусі. Апошняя публікацыя ў «ARCHE» – артыкул «Мястэчкі як культурна-гістарычны феномен Беларусі» (3/2010).

---

# Святочная культура мястэчак Беларусі

Мястэчка, шырока пашыраны калісьці тып паселішча, сімвалізуе цэлую эпоху ў гісторыі нашай краіны. Стракатасць складу насельніцтва мястэчак пры іх невялікіх памерах і адсутнасці ананімнасці вялікага горада, павольнасць штодзённага жыцця ва ўмовах традыцыйнага грамадства, своеасаблівы эканамічны і культурна-побытавы ўклад гэтых паселішчаў стваралі непаўторную атмасферу сусвету мястэчка, вельмі адрозную як ад горада, так і ад вёскі. Адметнай была і святочная культура мястэчак. Тут святкаваліся хрысціянскія, іўдзейскія, мусульманскія святы. Свецкая святочная культура яднала прадстаўнікоў розных этнасаў, веравызнанняў, сацыяльных групаў. Цэнтральнае месца ў ёй займала кірмашовае свята – святочныя гульні падчас кірмашоў у беларускіх гарадах і мястэчках XV–XIX ст.

## Кірмашовае свята

Кірмашы ў мястэчках прымяркоўваліся да хрысціянскіх святаў, што адлюстроўвае і этымалогія слова *кірмаш*. Этнограф А. Семянтоўскі ў працы, прысвечанай кірмашам Віцебскай губерні, адзначыў, што само гэтае слова прыйшло да нас ад немцаў, у якіх яно пішацца як спалучэнне слоў *die Kirche* – царква і *die Messe* – літургія. У руска-французска-нямецка-англійскім слоўніку Р.Рэйфа слова *kermasse* ці *karmess* перакладаецца як «храмавае свята»[1]. Традыцыйна «афіцыйнае» свята адбывалася да абедні, а пасля пачынаўся кірмаш. З XVI ст. гэта стала нормай звычаёвага права. Свята пачыналася разам з гандлем на рыначнай плошчы. Слова «кірмаш» у беларускай мове, як і ў заходнееўрапейскіх, азначае не толькі торг, але і свята, гулянне[2].

Працягласць кірмашоў, а значыць, і кірмашовых святаў, залежала галоўным чынам ад іх маштабу, г. зн. тавараабароту і колькасці народу. Чым вышэйшы быў абарот кірмашу, тым даўжэй ён праходзіў. Найбольш

---

[1] Гуд П. А., Гуд Н. І. Беларускі кірмаш. Мінск, 1996. С. 15.
[2] Катлярчук А. Кірмашовае свята // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 4. Мінск, 1997. С. 181.

працяглымі былі кірмашы ў мястэчках Зэльва (3–4 тыдні, звычайна з 26 ліпеня па 25 жніўня), Свіслач (спачатку 2 тыдні, а затым месяц, з 25 жніўня па 25 верасня), Бешанковічы (3–4 тыдні, звычайна з 6 па 27 ліпеня), Любавічы (месяц, з 6 студзеня па 6 лютага), Хаславічы (2 тыдні, з 24 ліпеня па 7 жніўня), Лагішын (2 тыдні, з 24 ліпеня па 6 жніўня), Гомель (з 1 па 7 студзеня) і інш. Такія кірмашы, як правіла, былі і найбольш прадстаўнічыя. Напрыклад, у 1837 г. на Бешанковіцкі кірмаш з’ехаліся прадстаўнікі болей за 200 дваранскіх, 50 купецкіх родаў, а таксама “рознага звання людзей – да 11000”. На Хрышчанскім кірмашы ў мястэчку Любавічы ў 1842 г. прысутнічалі прадстаўнікі 58 дваранскіх родаў, каля 100 купцоў, да 4000 чалавек «пасадскіх». У 1842 г. на Траецкі кірмаш у Гомель з’ехаліся каля 14000 чал., на Васільеўскі – каля 8000. На Шклоўскія кірмашы ў гэтым жа самым годзе з’ехаліся каля 10000 чалавек[3]. У разгар Ганненскага кірмаша ў Зэльве яго штодзённа наведвалі каля 3000 чалавек. Цікавыя суадносіны ўдзельнікаў апошняга кірмашу: у 1860 г. 41 % складалі гандляры, якія прыбылі з таварамі, 40 % – пакупнікі, астатняя частка – абслуга (у тым ліку тэатральныя акцёры, музыканты, 12 публічных жанчын)[4]. Натоўп на кірмашах быў разнастайны. Міхась Скобла прыводзіць падлікі, што на адным з кірмашоў у Зэльве на 100 хрысціян прыпадала 146 габрэяў, па 2 цыганы і 2 татарыны.

На кірмашах сутыкалася вялікая колькасць людзей, якія належалі да розных этнасаў, сацыяльных групаў, мясцовасцяў. Гэта ўяўляла з сябе ўнікальнейшы механізм этнакультурнага ўзаемадзеяння. Гандлёвая плошча ў Сіняўцы, паводле Паўла Шпілеўскага, «вся была усеяна разноцветными костюмами, платьями, нарядами, физиономиями и лицами»[5].

На кірмашах не толькі адбываўся гандаль, але і ўсталёўваліся трывалыя сувязі гараджанаў і местачкоўцаў з навакольным вясковым насельніцтвам. Гэта спрыяла пашырэнню і ўмацаванню ўзаемаадносін паміж гарадскім і сельскім насельніцтвам, прадстаўнікамі розных этнасаў і веравызнанняў, выпрацоўцы ў іх агульных густаў, пранікненню ў вёску гарадскога стылю паводзінаў, звычак, моды і культурных навыкаў.

У «культурнай праграме» кірмашоў былі прафесійныя і народныя тэатральныя прадстаўленні, выступленні ансамбляў музыкаў і цыркавых артыстаў, гульні, танцавальныя вечарыны. Наколькі прыкметна актывізоўвалася культурнае жыццё мястэчак падчас кірмашоў, сведчаць наступныя выказванні сучаснікаў. Адзін з самых пладавітых пісьменнікаў свету, аўтар каля шасці сотняў раманаў і аповесцяў, гісторык, грамадскі дзеяч, выхаванец Свіслацкай гімназіі Юзаф Крашэўскі ўганараваў Зэльву эксклюзіўнай кніжыцай, з якой адзін сказ набыў афарыстычнае гучанне. Сказ той тычыўся зэльвенскага кірмашу: «З вельмі даўніх часоў Зэльва і яе

---

[3] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі у горадзе Гродна (НГАБ у Гродне). Ф. 1, воп. 4, спр. 50, арк.1; Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 1430, воп. 1, спр. 20241, арк. 10; Ф. 2001, воп. 1, спр. 167, арк. 26; Ф. 295, воп. 1, спр. 610, арк. 48.

[4] Вайцешчык Г. С. Развіццё гандлю ў мястэчках Гродзенскай губерні ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.: Дыс. ... магістра гіст. навук. Гродна, 2008. С. 35.

[55] Шпилевский П. М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю. Минск, 1992. С. 55.

жыхары падпарадкоўваюцца дзіўнаму правілу – адзінаццаць месяцаў кожнага году марнеюць і толькі месяц жывуць»[6]. Паводле апісання Міхала Без-Карніловіча, Гомель у дні кірмашоў

*зусім ажыўляецца, выходзіць са сваёй дрымоты; падчас кірмашу сход рознахарактарных народаў паміж сабой, іх бурная дзейнасць, адмен ідэямі, думкамі, поглядамі; нарэшце, сродкі павесяліцца і з прыемнасцю правесці час, робяць Гомель падобным да губернскага горада*[7].

Маляўніча апісвае кірмашовую Свіслач Леан Патоцкі. Свецкую атмасферу падчас ладжання свіслацкіх кірмашоў ён параўноўвае з карлсбадскай – паводле багацця разнастайных формаў баўлення і шырокага ўдзелу арыстакратыі. З ягоных словаў, кірмаш быў важнай падзеяй, якую з найвялікшай нецярплівасцю чакалі як і гандляры, так і простыя людзі – маладыя і старыя. Першыя спадзяваліся на кірмашы шмат утаргаваць, другія – натанцавацца, трэція – нагаварыцца. Нічога так не нагадвала «замежныя воды», як Свіслацкі кірмаш. На ім назіраўся вялікі збор мясцовых паноў, якія жылі ў асобных дворыках, адведвалі адзін аднаго, рабілі прагулкі конна, пешшу, у павозках, штодня збіраліся на абеды, балі, публічныя маскарады, у тэатр[8].

Неадлучнай часткай кірмашовага свята быў *кірмашовы тэатр* – умоўная назва комплекса тэатральных дзеянняў, якія праводзіліся ў час штогадовых святочных таргоў. Гэта, перш за ўсё, народны тэатр[9]: выступленні скамарохаў і музыкаў, батлейка, інтэрмедыі. Кожны скамарох меў пэўную прафесію: музыкант (скрыпнік, дуднік), фокуснік, акрабат, важак дрэсіраванага мядзведзя, камедыянт, лялечнік і інш. Ёсць звесткі пра тое, што ў некаторых мястэчках Беларусі былі своеасаблівыя народныя цыркавыя школы, дзе з пакалення ў пакаленне перадавалася мастацтва беларускіх штукароў[10]. У мястэчку Семяжова (Магілёўская губерня) існавала школа фокуснікаў, выхаванцы якой выступалі на святах і кірмашах Беларусі, Літвы, Украіны, Польшчы[11]. На местачковыя кірмашовыя святы з’язджаліся «сляпцы»- лірнікі, якія выконвалі рэлігійныя, гістарычныя і жартоўныя песні. Для іх каля Турава існавала адмысловая школа падрыхтоўкі[12]. Наведваліся на кірмашы і студэнты-вандроўнікі са сцэнкамі-інтэрмедыямі.

У рэпертуар скамарохавых прадстаўленняў увайшлі пераасэнсаваныя абрадавыя дзеянні, сцэнкі калядоўшчыкаў, пародыі на рэлігійныя рытуалы або народныя традыцыі (вяселле, пахаванне), сатырычныя п’есы. У падобных

---

[6] Скобла М. Дзярэчынскі дыярыюш. Мінск, 1999. С. 31.

[7] Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии. Справочное издание факсимильного типа. Минск, 1995. С. 214.

[8] Патоцкі Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану. Мінск, 1997. С. 64.

[9] Нават у 1920-я гг. у мястэчках можна было сустрэць творы народнага тэатра, пра што сведчыць паведамленне 1928 г. у Інбелкульт пра тое, што ў мястэчку Нароўля Мазырскай акругі была запісана народна-рэлігійная драма “Продаж Ёсіфа”. Гл.: Наш край. 1928. № 5. С. 61.

[10] Гісторыя беларускага тэатра: У 3 т. Т. 1. С. 18.

[11] Гуд П. А., Гуд Н. І. Беларускі кірмаш. С. 89.

[12] Катлярчук А. Кірмашовае свята. С. 181.

невялічкіх мастацкіх творах не існавала дакладнага падзелу на артыстаў і гледачоў. Сцэнкі нараджаліся ў працэсе калектыўнай творчасці, тэкст быў імправізаваны, зберагалася толькі канва прадстаўлення. Магчымасць уключэння ў дзеянне любога гледача ўзмацняла эфектыўнасць псіхалагічнага і эстэтычнага ўплыву, надавала таргам яркую ідовішчнасць.

Адным з улюбёных прадстаўленняў, якія скамарохі дэманстравалі народу, была мядзведжая забава. Скамарохі прыбіраліся ў звярыныя скуры, перш за ўсё ў мядзведзяў. Гэта ішло яшчэ ад часоў паганства, калі мядзведзь з'яўляўся сімвалам шчодрасці і ўрадлівасці. Лічылася, што калі жанчына затанчыць з мядзведзем на Масленіцу, то ў яе абавязкова будуць дзеці[13].

Вельмі папулярнымі былі скамарохі з дрэсіраванымі мядзведзямі (скамарохі-мядзведнікі). Паводле некаторых звестак, у XIX ст. яшчэ працягвала існаваць галоўная на Беларусі школа дрэсіроўкі адлоўленых мядзведзяў у мястэчку Смаргонь, якая ўзнікла ў XVII ст. па ініцыятыве князёў Радзівілаў[14]. Яна атрымала ў народзе назву «Смаргонская акадэмія».

Выхаванцы «Смаргонскай акадэміі» пастаўляліся як на ўнутраны, так і на знешні рынак. Са сваімі важакамі яны хадзілі ў краіны Заходняй Еўропы, на Украіну і ў Расію. Пра школу дрэсіроўкі мядзведзяў захаваліся сведчанні шведскіх жаўнераў пачатку XVIII ст.:

*Тут у Смургонях дрэсавалі мядзведзяў для публічнага паказу. Кажуць, што ўсе скамарохі-павадыры мядзведзяў, з якімі яны вандруюць па свеце, маюць у Смургонях сваю Вышэйшую Школу, таму гэтае мястэчка для іх «зямля запаветная». Усе скамарохі, як і іншыя рамеснікі плацяць падаткі*[15].

Школа была арыентаваная на заходнееўрапейскага спажыўца. Увесну скамарохі разыходзіліся па свеце, узімку ж яны вярталіся ў Смаргонь, плацілі падатак Радзівілам і заставаліся тут да вясны. Смаргонскі настаўнік з «наравістым вучнем» былі ў XVIII–XIX ст. папулярным персанажам народнага лялечнага тэатра «батлейка». Захавалася нават іранічная прыказка: «вучань Смургонскай акадэміі». Пасля заняпаду Смаргонскай акадэміі сама прафесія перайшла да цыганоў[16].

Якім жа быў змест мядзведжай пацехі? Дрэсіраваныя мядзведзі разыгрывалі камічныя сцэнкі, кланяліся гледачам, танцавалі, ездзілі на палачцы, падавалі шапку і барабан гаспадару, паказвалі, як хлопчыкі крадуць гарох, круцілі жорны, лавілі рыбу, насілі ваду. Імкненне перавесці прадстаўленчую форму выступлення ў гульнявую змушала важакоў вучыць мядзведзяў новым прыёмам: мядзведзь дазваляў гледачам дакранацца да яго, падаваў ахвотным лапу і нават вазіў на сабе гледачоў ды мог з імі пабарукацца. Мядзведжая пацеха заўсёды суправаджалася каментарыямі важака, якія часам насілі сатырычны характар, мелі алегарычныя,

[13] Гуд П. А., Гуд Н. І. Беларускі кірмаш. С. 81.
[14] Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Гродзенская вобласць. Мінск, 1986. С. 320.
[15] Котлярчук А. Швэды ў гісторыі і культуры беларусаў. Менск, 2002. С. 153.
[16] Тамсама. С. 154.

гумарыстычныя параўнанні. Адна з такіх сцэнаў адлюстроўвала злабадзённую тэму непамернага ўжывання спіртовых напояў:

*А ну, Міхаіл, пакажы шаноўнай публіцы, як мужык Янка п'яны з кірмашу дамоў вяртаецца. Так, так, Міхаіл, весялей, – мужык Янка добрых дзве кварты*[17] *выпіў і таму ног пад сабой не чуе*[18].

Мастацтва скамарохаў, як своеасаблівая форма пратэсту, падвяргалася праследу ўладаў. Павел Шпілеўскі, паведамляючы пра жыццё цыганоў у мястэчку Мір, адзначыў, што цыганы раней займаліся медзведзеводствам, але пазней яно было забаронена. Сатырычная накіраванасць каментароў мядзведніка падавалася царскаму ўраду настолькі небяспечнай, што ў 1882 г. быў выдадзены ўказ аб забароне мядзведжай пацехі на тэрыторыі ўсёй Расійскай імперыі і забойстве дрэсіраваных мядзведзяў. Аднак цалкам знішчыць гэтую пацеху не ўдалося, і яна заставалася неадлучнай часткай народных гулянняў, святаў, кірмашоў ажно да пачатку Другой сусветнай вайны.

У ХІХ – пачатку ХХ ст. працягваў сваё існаванне і развіццё народны лялечны тэатр *батлейка*, вядомы з XVI ст. Батлейка была звязана з рэлігійным святам нараджэння Хрыста, святам Калядаў. Пра гэта сведчыць сама назва *батлейка* (ад *Betleem* – горад дзе нарадзіўся Ісус Хрыстос). Батлейка ладзілася з дабраславення Касцёла або Царквы ў святочны час – ад Раства да Хрышчэння, на Каляды і Новы год.

У некаторых мясцовасцях Беларусі ў канцы ХІХ – пачатку ХХ ст. з'явіўся своеасаблівы від батлейкі, дзе батлеечныя сцэны ігралі людзі. У прадстаўленнях «жывой батлейкі» інсцэніраваліся сюжэты на мясцовыя тэмы, народныя песні, казкі. Разам з традыцыйнымі персанажамі ў ёй выступалі мясцовыя паны, чыноўнікі, паліцэйскія. Захаваліся звесткі пра дзейнасць у Докшыцах у 1909–1916 гг. батлеечніка Патупчыка, які ў дні кірмашоў у сваіх пастаноўках расказваў народу розныя навіны[19]. Выступленні батлеечнікаў былі заўсёды надзённыя, вострасатырычныя і карысталіся вялікім поспехам у народзе.

Арыстакратыя ў кірмашовае свята забаўлялася аматарскім і прафесійным тэатрам іншага зместу. Да кірмашовых дзён прымяркоўваліся пастаноўкі прыгонных тэатраў, якія яшчэ працягвалі існаваць у канцы XVIII – пачатку ХІХ ст. Спектаклі і канцэрты ладзіліся ў цэнтрах адносна невялікіх маёнткаў – мястэчках Глуск, Дзярэчын, Свіслач, Дуброўна, Горы-Горкі, Чачэрск, Прапойск, Мір, Лагойск і інш. Буйныя магнацкія тэатры і капэлы высокага мастацкага ўзроўню існавалі ў мястэчках Шклоў і Ружаны.

Уражанні ад ружанскага тэатра ў 1778 г. пакінуў у сваім дзённіку літаратар Юльян Нямцэвіч:

---

[17] Кварта была роўная прыблізна 0,7 літраў.
[18] Гуд П. А., Гуд Н. І. Беларускі кірмаш. С. 159.
[19] Гуд П. А., Гуд Н. І. Беларускі кірмаш. С. 86.

*Запрасіў нас князь А. Сапега ў тэатр. Заля была новая, чыстая, дэкарацыі свежыя. Акторы, падрыхтаваныя з юных сялянаў і сялянак, сыгралі па-французску аперэтку Русо* «La devin village», *як мне падалося, няблага*[20].

Застаўся вельмі задаволеным, пачуўшы ружанскую капэлу ў 1784 г., кароль польскі і вялікі князь літоўскі Станіслаў Аўгуст Панятоўскі: ён загадаў шчодра ўзнагародзіць музыкаў.

Выдатнай з'явай у тэатральным жыцці Беларусі быў тэатр у Шклове, заснаваны вядомым фаварытам Кацярыны II, генерал-маёрам, графам Сямёнам Зорычам. Артысты тэатра Зорыча (прыгонныя беларусы) атрымалі высокую прафесійную падрыхтоўку – яны вучыліся ў лепшых педагогаў таго часу. У далейшым многія з прыгонных артыстаў, выхадцаў са Шклоўскага тэатра, служылі расійскаму мастацтву ў тэатрах Санкт-Пецярбурга і Масквы. У Зорыча былі дзве сталыя трупы – балетная і драматычная, хор і тры аркестры: так званая «хатняя музыка» (складалася з іншаземцаў), вялікі аркестр з прыгонных і «рогавая музыка». Рэпертуар тэатра складаўся з алегарычных балетаў з хорамі, міфалагічных пантамім, камічных опер і феерый. Пераважалі творы, як правіла, італьянскіх, нямецкіх і французскіх аўтараў. На сцэне Шклоўскага тэатра выступалі прыгонныя акцёры, кадэты шклоўскага корпуса, вялікасвецкія аматары, а таксама артысты прафесійных антрэпрызаў[21].

Пазагандлёвай часткай штогадовага чэрвеньскага кірмашу ў Шклове, акрамя спектакляў і канцэртаў, былі водныя маскарады. Па вадзе плавалі караблі, ішлі «марскія бітвы», інсцэніраваліся нападзенні «піратаў» на судны[22].

У свіслацкім тэатры, які фактычна быў пры гімназіі, паказы даваліся самымі рознымі сіламі. Былі паказы аматараў – вучняў гімназіі, запрашаліся праезджыя «вольныя» трупы Я. Шыманскага (1803), віленскага тэатра пад дырэкцыяй М. Кажынскага (1817–1819). Усе прафесійныя трупы ўладальнік Свіслачы Вінцэнт Тышкевіч браў на сваё утрыманне, плаціў ім грошы і даваў некаторыя каштоўныя прэзенты, за што яны павінны былі ставіць п'есы і нічога не патрабаваць ад публікі. Прыцягваліся да паказаў таксама артысты з сялян і жыхароў мястэчка. Вядома, што ў пачатку XIX ст. у свіслацкім парку быў пастаўлены аднапавярховы драўляны будынак пад гонтавым дахам, прызначаны спецыяльна для тэатра: тут мелася вялікая тэатральная зала (212 м. кв.) і 2 танцавальныя залы (83,5 м. кв.)[23]. Паводле ўспамінаў Леана Патоцкага, у кірмашовыя дні ў Свіслачы самадзейныя артысты інсцэніравалі асобныя песні Асіяна, урыўкі з сервантэсаўскага «Дон-Кіхота», сюжэты са Старога Запавету, грэцкай і рымскай міфалогіі, а таксама з айчыннай гісторыі. Л. Патоцкі апісвае такую сцэну:

---

[20] Цыт. паводле: Скобла М. Дзярэчынскі дыярыюш. С. 23.
[21] Гісторыя беларускага тэатра. Т.1. С. 213–215.
[22] Гуд П. А., Гуд Н. І. Беларускі кірмаш. С. 99.
[23] Архітэктура Беларусі: энцыклапедычны даведнік. Мінск, 1993. С. 432.

*Як толькі ўсталі з-за стала, усе прысутныя паселі на баркі і пры водгуках музыкі пачалі плаваць па ставе. Калі наблізіліся да аднае з выспаў, пад расцягнутым багатым шатром убачылі Канстанціна Астрожскага, які спачываў на ложы. Ён быў накрыты буркаю, навокал быў развешаны вайсковы рыштунак: зброя, шчыт, меч, коп'і, булава, харугвы – гетманская і здабытая ў непрыяцеля. Побач сядзела дачка. Малады збраяносец каля ног, падыгрываючы на ліры, спяваў вядомую думу Ю. Нямцэвіча пра перамогу пад Оршаю*[24].

Падчас кірмашоў наведвалі мястэчкі і ладзілі там свае прадстаўленні прафесійныя тэатральныя калектывы – прыватныя антрэпрызы. Прывядзём некалькі прыкладаў.

У пачатку XIX ст. у Гродне працавала ўстойлівая доўгачасовая антрэпрыза пад кіраўніцтвам шырока тады вядомай актрысы драматычных і музычных тэатраў Саламеі Дэшнер. Яе трупа вымушана была выязджаць на гастролі. 12 чэрвеня 1803 г. С. Дэшнер звярнулася да імператара Аляксандра I з прашэннем аб дазволе паказваць спектаклі на кірмашах у мястэчку Зэльве. У выніку яна атрымала манапольнае права праводзіць гастролі на працягу 6-ці гадоў не толькі ў Зэльве, але і ў іншых мястэчках Гродзенскай губерні[25].

Улетку 1805 г. мінская трупа шырока вядомага ў свой час акцёра, спевака, тэатральнага дзеяча М. Кажынскага наведала мястэчкі Хотаў і Бешанковічы[26]. Першыя тэатральныя гастролі ў Гомелі прайшлі падчас кірмашу ў маі 1824 г. у будынку ланкастэрскага вучылішча, калі да гамяльчанаў завіталі прафесійныя акцёры з Магілёва[27]. Каб паправіць свае фінансавыя справы, аб'язджалі мястэчкі і выступалі на кірмашах таксама іншыя буйныя тэатральныя прадпрымальнікі: К. Скібінскі, К. Шмідгоф, Д. Мараўскі, С. Навакоўскі[28].

Тэатральная дзейнасць з часам набірала ўсе больш шырокі размах. Да сярэдзіны XIX ст. на сцэнах Бешанковічаў, Асвеі, Шклова, Гомеля, Зэльвы, Ружанаў і іншых буйных мястэчак Беларусі igралі ўжо многія моцныя з мастацкага пункту гледжання тэатральныя калектывы. У іх ліку – трупы пад кіраўніцтвам А. Руткоўскага, К. Камінскага, Ш. Нядзельскага, В. Рашэўскага, Ю. Мілеўскага, Ф. Петшыкоўскага, Я. Хелмікоўскага, Я. Чаховіча, І. Лютомскага, І. Гатавіцкага і інш. Вядомыя імёны больш за пяцідзесяці антрэпрэнёраў, чые калектывы выступалі на сцэнічных пляцоўках Беларусі да 1861 г.[29]

Так, улетку 1847 г. трупа Я. Хелмікоўскага зрабіла чарговае турнэ па

---

[24] Патоцкі Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач... С. 69.
[25] Lietuvos valstybės istorijos archyvas. F. 378. Bendrasis skyrius, 1803 m., b. 266, l. 12.
[26] Гісторыя беларускага тэатра. Т. 1. С. 228.
[27] Кіштымаў А. Гомельскі маёнтак графа М. П. Румянцава: вопыт гаспадарання // Беларускі гістарычны часопіс. 1995. № 1. С. 25.
[28] Сельверстова С. Е. Развитие культуры Белоруссии в первой половине XIX в. (изобразительное и театральное искусство). Дис. … канд. ист. наук.: 07.00.02. Гродно, 1989. С. 109.
[29] Гісторыя беларускага тэатра. Т. 1. С. 230.

Магілёўскай губерні, наведаўшы мястэчкі Гомель і Хаславічы. У 1852 г. калектыў драматычных артыстаў пад кіраўніцтвам астраханскага памешчыка І. Гатавіцкага атрымаў дазвол на гастролі па павятовых гарадах і мястэчках Віцебскай губерні[30].

У 1854 г. у мястэчку Асвея падчас кірмашу былі зладжаныя чатыры тэатральныя паказы калектывам пад кіраўніцтвам Я. Чаховіча. Местачкоўцы і прыезжыя мелі магчымасць паглядзець наступныя спектаклі: камедыі-вадэвілі на рускай мове «Бенгальскі тыгр», «Аз і Ферт»; камедыі-оперы «Аброчны капялюш» на польскай мове, «Дзяўчына-гусар» на рускай мове (твор Ф. Коні, адзін з лепшых са «звычайных» дэмакратычных рускіх вадэвіляў), «Барабаншчык», «Сымон-Сірацінка»; вершаваную камедыю на польскай мове «Старая рамантычка», вадэвіль на рускай мове «Досыць!!!» і драму на польскай мове выдатнага польскага драматурга Ю. Кажанеўскага «Пані Кашталянава». Пасля спектакляў некаторыя акцёры танцавалі для гледачоў «Венгерку», «Мазурку». Кошт білетаў вагаўся ў залежнасці ад месца ад 15 кап. да 1 руб.[31]

Улетку 1856 г. трупа акцёра І. Лютомскага зладзіла тэатральныя паказы падчас кірмашоў у мястэчках Бешанковічы і Асвея[32]. У маі 1855 г. Я. Чаховіч дамагаўся ад віцебскага, магілёўскага і смаленскага генерал-губернатара дазволу ладзіць тэатральныя паказы ў мястэчку Шклоў[33].

На бешанковіцкім кірмашы ў 1859 г. выступаў тэатральны калектыў пад кіраўніцтвам Ф. Петшыкоўскага. Акрамя таго, былі зладжаныя акрабатычныя і гімнастычныя паказы саксонскіх артыстаў з Веймара – Вільгельма Шумана, Тэадора Тэйлера і ягонай жонкі Альберціны. У спісе іншаземцаў, якія прыбылі ў мястэчка Бешанковічы на час кірмашу, значацца таксама наступныя музыканты: Джакома Даміяні з Мілана, Франц Бертані, Эдуард Фіц з жонкай Паўлінай[34].

У пачатку ХХ ст. многія мястэчкі сталі пляцоўкай для зараджэння беларускага тэатра, спачатку аматарскага, а затым і прафесійнага. Гэта адлюстроўваюць матэрыялы газеты «Наша Ніва», напрыклад, такая зацемка:

*Ракаў, Мінск. губ і пав. У нядзелю 22 красавіка ў нашым мястэчку адбылося, с пазваленьня мінскаго губэрнатара, беларускае прэдстаўленьне. Ставілі на сцэне «Міхалка», «Трагік па няволі», «Чым шкодзіць тытун». Тэатр быў у доме пажарнага таварыства. Сабралося шмат публікі, асоб 130, найбольш тутэйшые мешчане. Вялікая шкода, што цесната не пазволіла пусьціць усіх, хто хацеў, і прышлося многа людзей атправіць, бо не хапіло білетоў і мейсца. Сцэна так сама цесная, дык не пазволіла і артыстом разыйсціся, як трэба. Але аднак з усяго было відаць, што людзям падабалося гэтае прэдстаўленьне: ўсе хахаталі да ўпаду*[35].

[30] НГАБ. Ф. 1297, воп. 1, спр. 17415, арк. 107 адв., 137; Ф. 1430, воп. 1, спр. 23102, арк. 1, 2.
[31] Тамсама. Спр. 26684, арк. 10–13.
[32] Тамсама. Ф.1430, воп. 1, спр. 28988, арк. 1.
[33] Тамсама. Спр. 24853, арк. 1.
[34] Тамсама. Ф.1297, воп. 1, спр. 30605, арк. 3–4.
[35] Наша Ніва. 1912. 3 (16) траўня. №18. Цытаты з “Нашай Нівы” падаюцца з захаваннем мовы арыгінала.

Паралельна з варыянтамі кірмашовага тэатра на местачковых штогадовых святочных таргах узнікаюць і развіваюцца разнастайныя *пацехі і забавы масавага характару*.

На кірмашах ладзіліся *танцы*. Так, у Асвеі ў 1854 г. падчас кірмашу такіх танцавальных вечароў было тры: 27, 28 і 29 чэрвеня. На іх прысутнічалі дваране: на 1-ым – 25 мужчын і 20 жанчын, на 2-ім адпаведна – 20 і 13; на 3-ім – 34 і 25. Начальнік Магілёўскай губерні 26 студзеня 1851 г. даносіў віцебскаму, магілёўскаму і смаленскаму генерал-губернатару, што ён дазволіў танцавальныя вечары ў мястэчку Шклоў[36]. Падчас Зэльвенскага кірмашу танцавальныя вечары ладзіліся ў начной карчме, празванаю «Сабачаю горкаю», дзе да самай раніцы танцы «абслугоўваў» аркестр скрыпак у складзе 15 музыкаў[37].

Важнае месца ў кірмашовым свяце займала карчма. Гэта было месца не толькі для піцця і заключэння гандлёвых дамоваў, але таксама і для грамадскага адпачынку з музыкамі, скамарохамі, спевамі і танцамі, батлейкай, гульнёй у карты. Вось як, паводле апісання П. Шпілеўскага, адбывалася «арганізацыя» народнага гуляння на таргах каля карчмы ў Сіняўцы:

*...адзін з хлопцаў з’явіўся са скрыпкай, пацягнуў дугападобным смычком, і ахвотніцы да скокаў імгненна збегліся: каля музыкі ўтварыўся вялізны карагод дзяўчат, якія сталі танцыць і спяваць. Сярод скокаў я заўважыў два танцы, зусім не падобныя на скокі велікарускага прастапароддзя: мяцеліцу і пацяруху накшталт так званай полькі –* tremblante[38].

На кантрактовых кірмашах прапагандаваліся пераважна модныя тады бальныя танцы. Распаўсюджанымі былі разнастайныя полькі, кракавякі, кадрылі, мазурка. На агульнанародных кірмашах танцы і карагоды адлюстроўвалі традыцыйную харэаграфічную творчасць беларусаў. Толькі ў канцы XIX – пачатку XX ст. у выніку этнакультурных кантактаў у святочным жыцці беларусаў з’явілася руская «барыня», а пад уздзеяннем шляхецкіх забаваў – «кадрыль». Беларускі музычны інструментарый узбагаціўся новым інструментам – на кірмашы зайграў гармонік. У апісанні кірмашу Барысаўскага павета Павел Шэйн адзначаў, што

*звычайна на кірмашы з’яўляюцца дамарослыя музыкі, большай часткай са скрыпкамі, а ў апошні час і з гармоніямі, пад музыку якіх моладзь скачыць крутуху, бычка, барыню, лявоніху, мяцеліцу, а таксама кадрылю… Хлопцы паказваюць сваю ўдаласць моцным прытопваннем абцасамі ў такт музыцы, ламаннем шапкі набок, размахваннем рукамі і спяваннем далёка не*

[36] НГАБ. Ф. 1430, воп. 1, спр. 26684, арк. 5; Ф. 1297, воп. 1, спр. 22373, арк. 3.
[37] Гуд П. А., Гуд Н. І. Беларускі кірмаш. С. 90.
[38] Шпилевский П. М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю. С. 55.

*сціплага зместу прыпевак і ў апошнім, дарэчы, дзяўчаты нікольki не адстаюць ад хлопцаў, нікольki не саромеючыся*[39].

Прыпеўкі часта спявалі і самі музыкі (дудары і скрыпачы).

Расійскі мастак І. Захараў, вандруючы па Беларусі ў 1850-я гг., таксама вылучае танцавальныя забавы як адметную рысу беларускіх кірмашоў:

*Давялося мне быць на кірмашы ў Беларусі. На гэтыя святы збіраецца, звычайна, шмат народу, які… скача да позняй ночы… Да ліку абавязковых членаў кірмашу належаць музыкі, якіх у беларусаў называюць дударамі, згодна свайго інструмента – дуды*[40].

На асобных кірмашах танцы насілі характар своеасаблівага спаборніцтва, дзе ўдзельнікі як паасобку, так і ў парах імкнуліся заваяваць найбольшыя сімпатыі гледачоў. Падчас танцаў часам маглі адбывацца неафіцыйныя конкурсы фальклорна-інструментальных ансамбляў. На кірмаш збіраліся музыканты з усіх навакольных вёсак, дамаўляючыся: хто ў гэтым годзе стане лепшым на кірмашы, таму будзе і перавага ігры на вяселлях усёй акругі. Ігралі ўсе адначасова ў розных месцах. Дзе больш народу спявае ды скача – той аркестр і пераможца. Як сведчаць інфарманты,

*на кірмашы ў Шацілаве збіралася вельмі многа музыкантаў... Калі нашыя хлопцы перайграюць на гармоніках другіх хлопцаў, тады іх усе хваляць, а яны фарсяць*[41].

У некаторых месцах на кірмашах адбываліся песенныя конкурсы: спаборніцтвы ў песнях і прыпеўках паміж суседнімі вёскамі. Інфарманты сведчаць, што на кірмашы Полацкага павета «збіраліся з адной кампаніі хлопцы, а дзеўкі і бабы з другой, спаборнічалі, якая кампанія лепш спяе прыпеўкі. Вось адна з іх:

*Замараўся бел-платочак*
*У мяне на галаве,*
*Загуляўся мой мілочак*
*У чужой, дальняй стране,*
*А я ўвосеньскі сасніла,*
*Што ў палонцы ён утапіўся*
*Відна стоіў ён таго,*
*Што дзеўкі ўкінулі яго.*

Хлопцы ў адказ спявалі:

[39] Гуд П. А., Гуд Н. І. Беларускі кірмаш. С. 91.
[40] Тамсама.
[41] Тамсама. С. 104.

*Маю мілку зваць Хрысцінка –*
*Рукадзельніцай была:*
*Рашатом кароў даіла,*
*Тапаром авец стрыгла*[42].

Цікавымі забавамі былі *маскарады* – камерцыйныя касцюмаваныя танцавальныя вечарыны, якія вымагалі ад удзельнікаў наяўнасці масак. Маска гарантавала роўнасць у сацыяльна мяшанай кампаніі адпачываючых (шляхта, купецтва, разначынная інтэлігенцыя). Акрамя таго, маска стварала пэўныя авантурныя ўмовы для ўзаемаадносінаў палоў. Вакол маскарадаў узнікала мноства легендаў. Мемуарысты распавядаюць пра містычныя здарэнні, звязаныя з маскарадамі, пра прароцтвы, якія адбываліся на іх, пра з'яўленне на маскарадах памерлых і інш. Але перадусім маскарад быў месцам нястрыманай весялосці, дзе дазваляліся рэчы, табуяваныя ў звычайных абставінах. Галоўнымі забавамі на маскарадах былі танцы і картачная гульня. Падчас вечарыны за асобную плату можна было набываць алкаголь[43].

Пра ладжанне маскарадаў, а таксама азартных гульняў падчас зэльвенскага кірмашу ўзгадвае Л. Патоцкі:

*Зэльва няблага забудаваная. Шырокая вуліца праразае яе ўздоўж ажно да канца горада, дзе крокаў за трыста на ўзгорку стаіць парафіяльны касцёл. На гэтай вуліцы па адзін бок – мураваныя магазіны, па другі – заезны двор, у якім месціцца шынок, тэатр, маскарадныя залы, і тая «Срэбраная», як яе называлі, зала, у якой некалькі гадоў перад гэтым цэлая зграя шулераў, што сцерагла чужыя кішэні, цягнула банкі, напэўна абыгрываючы навічкоў. Раз на год у Зэльве адбываліся кірмашы, пераважна конскія… Штораніцы з стайняў выводзяць коней, аб'язджаюць, прабуюць, таргуюць, прадаюць або купляюць. Пасля абеду ўсе разбрыдаюцца па магазінах, вечарам – тэатр, маскарад, «Срэбраная зала» або дамоўленыя сходкі на прыватных дамах*[44].

Для тэатральных дзеяў у Зэльве было спецыяльна пабудавана памяшканне. Асаблівасцю яго канструкцыі з'яўлялася адсутнасць ложаў для прадстаўнікоў арыстакратыі: іх замяняў «дэмакратычны» балкон, які запаўняла розная публіка без сацыяльных адрозненняў. Гэта матывавалася імкненнем размясціць максімальную колькасць гледачоў. Відовішчы, што паказваліся ў Зэльве, былі рознажанравымі: тут часта выступаў тэатр з Вільні, вандроўныя артысты з Расіі і з-за мяжы, дэманстраваліся цыркавыя праграмы, ладзіліся імпрэзы, складзеныя з танцаў і індыйскіх гульняў.

[42] Тамсама. С. 103.
[43] Шыдлоўскі С. Урбаністычны аспект культуры баваў прывілеяванага саслоўя Беларусі ў першай палове XIX ст. // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры: зборнік навук. артыкулаў. Гродна, 2007. С. 286.
[44] Патоцкі Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач… С. 141, 143.

Напрыклад, у 1860 г. французскі антрэпрэнёр Людвіг Персуар паказаў у Зэльве 12 цыркавых прадстаўленняў, а таксама ладзіў танцавальныя вечары[45].

На кірмашах Беларусі XIX ст. распаўсюджваюцца *азартныя гульні*. Адной з такіх гульняў, што панавала на кірмашы ў Зэльве, была *рулетка*. З'яўленне гульнявога дома ў Зэльве звязана з забаронай французскага ўрада іграць у рулетку ў Парыжы (1840 г.) Парыжскія і расійскія купцы прывезлі рулетку да нас і назвалі *фартунай*. Менавіта гэтая гульня прываблівала ў Зэльву велізарную колькасць памешчыкаў, чыноўнікаў і многіх іншых аматараў вострых адчуванняў. Уладары гульнявога дома атрымлівалі вялікія прыбыткі[46].

Вельмі пашыранымі былі на кірмашах картачныя азартныя гульні. Карты як азартная гульня згадваюцца ў актавых матэрыялах Вялікага Княства Літоўскага ў XVII ст. як забароненая форма адпачынку[47]. У часы Расійскай імперыі ўлады таксама вялі ўпартую, але безвыніковую барацьбу з гэтым відам забаваў (закрыццё ігральных дамоў, высылка гульцоў з гарадоў, ганенні на ўдзельнікаў азартных пацехаў на кірмашах).

На кірмашах папулярнымі былі і такія гульні, як «тронка» (кіданне тронак – гліняных ці свінцовых шарыкаў у ямкі), «цот-лішка». У канцы XIX – пачатку XX ст. на кірмашах з'яўляюцца *турніры асілкаў і барцоў*, на якія кожная вёска выстаўляла свайго прадстаўніка. Праводзіліся *спартыўныя гульні*. У Століне, напрыклад, арганізоўваліся жартоўныя спаборніцтвы на вадзе: веславанне ў бочках цераз раку Гарынь; пераход рэчкі па дну з кавалкам дзёрану і камянём на галаве[48].

Ладзіліся на кірмашах таксама *конныя турніры і гульні*. Паводле ўспамінаў Л.Патоцкага, у Свіслачы ў 1816 г. былі

*скачкі на нашых краёвых конях, але без камедыянцкага пераапранання. Недалёка за горадам выбралі шырокую вёску як месца паказальных выступленняў. Уся прыгожая палавіна выступіла ў наймоднейшых строях. Гледачоў было многа. Герман Патоцкі на доблеснай сваёй клячы з боцькаўскага статку перамог сваіх супернікаў і падчас абеду ў сваёй маткі быў увенчаны каронаю, звітай з свежых кветак. Не адна пекная ручка прычынілася да гэтага, а найпрыгажэйшая сярод прыгожых надзела яе яму на галаву*[49].

Цікавая конная гульня існавала ў Століне. Інфармант паведамляе:

*праводзілі выпрабаванні цяглавых коней: на дыстанцыі паўкіламетра клалі на зямлю торбы з пяском, а конь з возам ішоў міма іх. Людзі кідалі гэтыя торбы на воз. Конь, які спыняўся, выходзіў з гульні, а калі давозіў груз*

[45] Гуд П. А., Гуд Н. І. Беларускі кірмаш. С. 100.
[46] Тамсама. С. 94.
[47] Тамсама. С. 95.
[48] Тамсама. С. 110.
[49] Патоцкі Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач… С. 68.

*да мэты – тады прыз (грашовая прэмія і дармавая падкоўка каня на чатыры нагі.*

Жыхары Століншчыны «самі недаядалі, а жарабкоў адкормлівалі да гэтых кірмашоў»[50].

Яшчэ адной цікавай з'явай культурнага жыцця кірмашоў былі *атракцыёны*. У кірмашовую забаву ператварыўся старажытны веснавы магічны звычай беларусаў – *гушканне на арэлях*, якое ў народзе лічылася сродкам ачышчэння чалавека пры дапамозе паветра. У многіх мясцовасцях Беларусі на кірмашах працавала платная *карусель*. Карысталася папулярнасцю *перацягванне каната*. На Віцебшчыне ў гэтай забавы была адметнасць. Удзельнікі камандаў прывязваліся вяроўкамі да каната, каб ніхто не мог выйсці з гульні самастойна. Канат цягнулі праз невялікую рэчку і тыя, каго супернік перацягваў, валіліся ў ваду, што выклікала вясёлае ажыўленне ў прысутных. Часам прайграўшыя запрашалі пераможцаў не келіх піва. На Гродзеншчыне набыў папулярнасць атракцыён «прызавы слуп» з арыгінальным тэхнічным вырашэннем. Укапаныя ў зямлю два слупы злучаліся рухомай вяроўкай з прывязанымі прызамі. За адзін канец яе трымаў чалавек, які апускаў і падымаў прыз. Гулец пачынаў лезці па бервяну, а прыз падымаўся ўсё вышэй і вышэй. Калі гулец не вытрымліваў і пачынаў спускацца, прыз накіроўваўся за ім, і гулец зноў стараўся яго дастаць. Атракцыён меў ярка выяўлены гульнявы характар, што садзейнічала стварэнню ўсялякіх камічных сітуацый.

Унікальны атракцыён дзейнічаў на кірмашы ў Пружанах – шацёр-розыгрыш, ці проста будка з надпісам «Сакалова матка». Ахвотныя за 50 грошаў набывалі права ўваходу ў будку, дзе бачылі звычайную варону. Умовай атракцыёна з'яўлялася захаванне таямніцы ўбачанага, і менавіта гэтая таямнічасць прыцягвала людзей[51]. Падобныя мерапрыемствы надавалі кірмашам мясцовы каларыт і своеасаблівасць, далучалі да кірмашовых гульнявых дзеяў шырокія пласты насельніцтва.

Такім чынам, кірмашовыя імпрэзы вылучаліся разнастайнасцю, масавасцю і сацыяльнай стракатасцю ўдзельнікаў. Забавы арыстакратыі, галоўным чынам, набывалі форму розных прадстаўленняў, дзе існаваў падзел на артыстаў і гледачоў, што дазваляла сузіраць відовішча, а не ўдзельнічаць у ім. Народныя пацехі ўвасабляліся ў масава-гульнявых дзеяннях, якія не патрабавалі спецыяльнай падрыхтоўкі і таму ядналі людзей розных узростаў. Кірмашовае свята стварала ілюзію ўсеагульнай роўнасці, прыўносіла адчуванне радасці быцця, зямнога раю, жыцця «адвечнага народнага цела»[52].

## Паліфанічнасць святочнай культуры мястэчак

[50] Гуд П. А., Гуд Н. І. Беларускі кірмаш. С. 106.
[51] Тамсама. С. 106, 107, 109.
[52] Катлярчук А. Кірмашовае свята. С. 181.

Паколькі кірмаш усё ж насіў эпізадычны характар, то кірмашовае свята, пры ўсёй насычанасці і разнастайнасці яго праграмы, было ўсяго толькі яркім штогадовым эпізодам. У той ж час святочная культура мястэчак мела шмат іншых бакоў і праяваў.

Вынікам поліэтнічнасці і поліканфесійнасці мястэчак з'яўлялася разнастайнасць іх рэлігійнага і культурнага жыцця. Соцыякультурная прастора мястэчак Беларусі ўяўляла сабой своеасаблівую *terra incognita*, беларускі трохкутнік «царква – касцёл – сінагога» (а часам нават чатырохкутнік «царква – касцёл – сінагога – мячэць»), у якім адбываўся бясконцы спектакль жыцця. Адсюль і поліфанічнасць святочнай культуры гэтых паселішчаў. Тут святкаваліся *праваслаўныя, каталіцкія, іудзейскія і мусульманскія святы*.

Гістарычныя крыніцы адлюстроўваюць розны характар кантактаў паміж прадстаўнікамі этнаканфесійных групаў насельніцтва падчас святаў: сяброўскі, нейтральны, непрыязны. Прывядзём некалькі прыкладаў, узятых з успамінаў жыхароў мястэчак. З гэтай мэтай намі выкарыстаныя: мемуары аб сваім родным мястэчку Капыль сярэдзіны XIX ст. Мендэле Мойхер-Сфорыма, заснавальніка новай габрэйскай літаратуры на мове ідыш; мемуары публіцыста, прыкметнай постаці беларускай дыяспары ў ЗША Васіля Стомы (псеўданім Сініца), прысвечаныя мястэчку Лужкі міжваеннага перыяду, калі Заходняя Беларусь была ў складзе Польшчы[53]. Дапамагаюць уявіць святочную культуру мястэчак міжваеннага часу і матэрыялы з кнігі Ірыны Раманавай і Ірыны Махоўскай «Мір: гісторыя мястэчка, што расказалі яго жыхары»[54], з'яўленне якой стала магчымым дзякуючы таму, што 85 жыхароў Міра 1910-х—1940-х гадоў нараджэння расказалі свае гісторыі выкладчыкам і студэнтам гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта падчас этнаграфічнай практыкі ў ліпені 2003 г. і ліпені 2005 г.). Штодзённае жыццё местачкоўцаў, іх будні і святы знайшлі адлюстраванне і ў матэрыялах тагачаснага перыядычнага друку, у прыватнасці першай беларускай газеты «Наша Ніва» (1906–1915 гг.).

Хрысціянскія каляндарна-царкоўныя святы ў мястэчках амаль поўнасцю паўтаралі вясковую традыцыю (ваджэнне «казы», «кабылы», «жорава» на Каляды; арэлі, катанне яек на Вялікдзень; завіванне вянкоў на Тройцу і інш.). Асноўнымі святамі, якія адзначалі местачкоўцы-хрысціяне, былі Каляды, Вялікдзень, Тройца (Сёмуха, Пяцідзясятніца), Пятро, Ушэсце, Спас, храмавыя святы.

Жыхары Міра ўспамінаюць:

*На Каляды елку ўпрыгожвалі, лапінкі елкі вешалі на дзверы. Пяклі булкі з макам, рыбу ў цесце, смажанкі з макам, куццю. У святочны вечар перад вячэрай мы садзіліся на покуць, і папа з парога пачынаў «сеяць», гэта*

---

[53] Мойхер Сфорим М. История одной жизни: воспоминания писателя // Еврейский мир. 1909. Май; Стома-Сініца В. Маё мястэчка // Полымя. 1998. № 9. – С. 179 – 223; № 10. – С. 235 – 266; № 11. – С. 226 – 240; № 12. – С. 156 – 222.

[54] Раманава І., Махоўская І. Мір:гісторыя мястэчка, што расказалі яго жыхары. Вільня, 2009.

*значыць кідаць зерне. Мы фартухі трымалі, і ў каго колькі ў фартуху зерня акажацца, столькі і баранчыкаў будзе. Цэлы дзень елі поснае, ніякага мяса, на наступны дзень – каўбаса з верашчакою і куцця з салам. Пост цягнуўся 6 тыдняў. Абавязкова на вячэру елі булкі з макам. Ішлі ў клуб на танцы на ўсю ноч, перад гэтым выпівалі водкі па 3 шкляначкі з чакушкі… Тады столькі п'яніц не было, як зараз, усё было культурна*[55].

Святам усіх святаў лічыўся Вялікдзень, якому папярэднічалі 7 тыдняў посту. Святкавалі Вялікдзень тры дні: у першы дзень звычайна не выходзілі з дому і праводзілі час толькі сваёй сям'ёй. На другі дзень з'язджаліся сваякі, усе «хрыстосаваліся» і дарылі адзін аднаму яйкі. У гэты дзень было прынята хадзіць у госці ці прымаць іх у сябе. Вечарам хлопцы чалавек па 8–12 хадзілі па хатах з валачобнымі песнямі, у якіх славілі гаспадароў і Вялікдзень. З мястэчка *Германавічы* Дзісенскага павета ў «Нашай Ніве» паведамлялася:

*Падходзіць Вялікдзень, і хлопцы рыхтуюцца хадзіць з валачобным. Ужо цяпер збіраюцца па хатах і пяюць «Хрыстос». Калі-ж прыйдзе вечэр Вялікадня, ўся округа ажно дрыжыць ад ноты гэтай старасьвецкай песьні*[56].

На трэці дзень свята пачыналася вялікае гулянне, і ўсе выходзілі на вуліцы. Моладзь калыхалася на арэлях, качала фарбаваныя яйкі, спявала пад гармонік ці скрыпку.

Найбольш блізкімі паміж сабой, натуральна, былі каталіцкія і праваслаўныя святы. Так, Васіль Стома-Сініца, аўтар мемуараў пра Лужкі міжваеннага часу, адзначае, што некаторыя местачкоўцы шанавалі ўсе хрысціянскія святы, нягледзячы на сваё веравызнанне. Напрыклад, каталічка цётка Юлька адзначала і праваслаўныя святы. Праваслаўныя практыкавалі маленне па кантычках – каталіцкіх малітоўніках; праваслаўны дзед Ярох увогуле не рабіў розніцы паміж праваслаўнымі і каталіцкімі малітвамі[57].

Паводле вусных успамінаў, сабраных у мястэчку Мір, найбольш блізкімі і зразумелымі для ўспрымання з боку беларусаў былі татары. Агульнымі для прадстаўнікоў абодвух народаў былі не толькі беларуская мова, але і род заняткаў ды лад жыцця. З павагай міране-беларусы расказваюць пра спосабы татарамі штодзённага хлеба, пра іх будні і святы. Міране ўспамінаюць:

*Варожасці паміж татарамі і намі не было. Размаўлялі яны паміж сабой і з намі па-нашаму, але маліліся па-свойму.* [...] *Татары працавалі, як пчолкі. Яны былі галоўнымі агароднікамі.* [...] *Татары адзначаюць свае святы. Родныя прыязджаюць, ціха, прыгожа. У іх* Байрам *быў. Спіртнога няма ніколі на стале. У іх ніколі ніякіх скокаў не было, не сварацца. Самае*

[55] Тамсама. С. 55.
[56] Наша Ніва. 1912. 22 лютага (4 сакавіка). № 12–13.
[57] Стома-Сініца В. Маё мястэчка // Полымя. 1998. № 9. – С. 180.

*моднае ў татар – скрыпка. Іх нацыянальнае блюда – макаронка з мясам – перакачнік. Кожную пятніцу святкавалі*[58].

Найбольш адрозным, «чужым» для местачкоўцаў-хрысціянаў з'яўляўся лад жыцця габрэяў. Незразумелыя і, разам з тым, дзіўныя для беларусаў традыцыі габрэяў нярэдка станавіліся нагодай для жартаў з боку дзяцей. Міране ўспамінаюць:

*Восенню свята іх было,* «кучкі» *называлася*[59]*, то яны адкрывалі вокны, на вуліцы накладвалі кучы хворасту, пасля запальвалі яго, мокры ён усё дыміў, дыміў, а яны ўсё маліліся. Яны ў дварах будавалі спецыяльныя шалашы і ўвесь тыдзень там маліліся. Яны моляцца, цэлыя сем'і і родныя, пры свечках, але самім запальваць і тушыць іх ім нельга. Пагэтаму яны за грошы клікалі дзяцей.* [...] *Яны рабілі, каб частка даху дому, метры два, падымалася ўверх, ну а потым, пасля кучак, апускалася. Пакуль кучкі, трымалі адчынены дах. Там яны прымалі ежу, пад дажджом. А дзеці яшчэ і як хуліганілі! Так мы, бывала, ідзём са школы* [...] *і каштанамі, ці палкамі якімі імкнёмся туды, у гэтую дзірку трапіць. І яйкі, вядома, не курыныя, назбіраем шпаковых, ад галак* [...] *Яек назбіраем і туды яйка – плюх! А яны ўжо як выскачаць: «Ой, сволач, ты!». І па-габрэйску. І «хам»? і «кацапы» нас называлі...*[60].

Выклікала цікавасць местачкоўцаў-негабрэяў і дзіўнае з іх пункту погляду святкаванне *Пурыма*[61] – спецыфічная форма карнавалу, калі па вуліцах мястэчка праходзіць вясёлае шэсце пераапранутых у традыцыйныя сатырычныя персанажы папа[62], бабы, розных жывёл. Вясёлыя спевы і карагоды пад гукі духавых і ўдарных музычных інструментаў адбываюцца ў час свята *Сімхат Тора*, прысвечанага заканчэнню гадавога цыкла чытання Торы[63].

Успаміны часта фіксуюць факты, калі іўдзеі і хрысціяне наведваюцца ў госці, у тым ліку і падчас святаў. Так, Васіль Стома-Сініца, аўтар успамінаў пра Лужкі міжваеннага часу, апісвае, як ён і яго сябар Аба часта хадзілі адзін да аднаго ў госці. Пры гэтым Аба ніколі не адмаўляўся ад «трэфных»[64]

---

[58] Раманава І., Махоўская І. Мір: гісторыя мястэчка… С. 44.

[59] Маецца на ўвазе габрэйскае свята *Суккот* (з іўр. – шалашы, кушчы) – сямідзённае свята ў памяць аб бадзяннях габрэяў па пустэльні пасля выхаду з Егіпта.

[60] Раманава І., Махоўская І. Мір: гісторыя мястэчка… С. 41–42.

[61] Пурым – свята ў гонар выратавання габрэяў Персідскай імперыі ад пагібелі ў выніку інтрыгаў персідскага дарадцы Амана (паводле біблейскай Кнігі Эсфір (Эстэр)). У час святкавання праводзяцца маскарады.

[62] У Беларусі ў пурымным шэсці "ўдзельнічалі" не толькі героі самой пурымнай гісторыі (Эстэр, Аман), але і персанажы з местачковага жыцця, у тым ліку часам і праваслаўны святар (як правіла, пузаты і п'янаваты – смяяліся такім чынам не з праваслаўнай веры, а з таго, што сапраўднае жыццё некаторых святароў было далёкім ад біблейскага ідэалу)

[63] Сабалеўская В. А. Яўрэі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.: лад жыцця і культура: Дыс. ... кандыдата культуралогіі. Гродна, 1999. С. 77.

[64] Трэфныя – непрыдатныя да ўжывання габрэямі згодна з правіламі Галахі (нарматыўная частка габрэйскага рэлігійнага законавучэння, якая рэгламентуе рэлігійнае, сямейнае і грамадзянскае жыццё).

страваў, і асабліва любіў вэнджаную каўбасу і дранікі з салам. Васілю таксама смакавалі іўдзейскія святочныя стравы:

*Аднаго разу ў часе жыдоўскіх святкоў Пэйсаху*[65] *я быў у Абы, і ягоны дзед частаваў мяне дамовага вырабу віном і мацой*[66]. *Памятаю, у часе размовы ён напаўжартам зазначыў:*

*– Я ведаю, што, бываючы ў вас, мой Аба жарэ сала і каўбасы. Ну і чорт яго бяры, усё роўна ён не пайшоў па Казьлінерах. Але памятай, каб ты не паглядаў ласым вокам на Соньку (гэта маладзейшая сястра Абы), бо я табе другую нагу адкручу* (Васіль кульгаў на адну нагу. – *І. С.*).

*Заўвага старога моцна забалела мяне, і я адказаў:*

*– Калі я магу есці вашу рэлігійную мацу і піць пэйсахавае віно, то і Абу нічога благога ня станецца ад сала і каўбас. Што ж датычыць Соньні, то яна, калі захоча, знайдзе прыгажэйшага і здаравейшага за мяне гоя.*

*Мой адказ, відаць, спадабаўся старому, бо ён, нічога не сказаўшы, толькі махнуў рукой, усміхнуўся і выйшаў з пакою. А Аба яшчэ праз доўгі час перапрашаў мяне за нетактоўнасць дзеда*[67].

Нягледзячы на тое, што габрэі частавалі мацой сваіх суседзяў-негабрэяў, трывалымі былі і страхі ды забабоны, звязаныя з так званым *крывавым нагаворам*[68]. Жыхары мястэчка Мір успамінаюць:

*Дзяцей пужалі жыдамі, што могуць схапіць, засунуць у бочку з цвікамі і катаць. Гэта ім трэба, каб прыгатаваць мацу з дзіцячай крыві*;

[...] *бацькі нас пераканалі, што на свае святы габрэі ловяць праваслаўных і каталіцкіх дзяцей і бяруць з пальца кроў, якую дабаўляюць у цеста мацы*[69].

Працягвалі існаваць такія забабоны і ў Лужках. В. Стома-Сініца згадвае пра тое, што ў дзяцінстве ён адважваўся выходзіць да рынкавай плошчы, нягледзячы на застрашванні бабулі, што там яго габрэі схопяць «на мацу»[70].

Ва ўспамінах аб мястэчку Капыль Мендэле Мойхер-Сфорым адзначаў:

*У мястэчку габрэі і хрысціяне жылі паміж сабой у згодзе, дружна, не хаваючы адзін ад аднаго ні сваіх радасцяў, ні журботаў. Калі які-небудзь габрэй іграў вяселле, знаёмыя хрысціяне прысылалі вясельныя падарункі: хто*

---

[65] Песах – свята ў памяць аб выхадзе габрэяў з Егіпта і вызваленні з рабства.
[66] Маца – ляпёшкі з неквашонага цеста, адзіны мучны выраб, дазволены для ўжывання ў перыяд пасхальнага тыдня.
[67] Стома-Сініца В. Маё мястэчка // Полымя. 1998. №12. С. 164.
[68] *Крывавы нагавор* – абвінавачванні габрэяў у забойстве хрысціянаў для выкарыстоўвання іх крыві ў рытуальных мэтах.
[69] Раманава І., Махоўская І. Мір: гісторыя мястэчка… С. 43.
[70] Стома-Сініца В. Маё мястэчка // Полымя. 1998. № 9. С. 182.

*курыцу, хто некалькі дзясяткаў яек, хто каравай хлеба, а хто куліч – кожны паводле сваіх магчымасцяў. Тое ж паўтаралася ў выпадку ўрачыстасці ў каго-небудзь з хрысціян*[71].

Супрацьлеглае сведчанне, праўда, прыводзілася ў № 17 «Нашай Нівы» за 1908 г. Карэспандэнт з мястэчка Краснае Вілейскага ўезда паведамляў:

*У мястэчку хрысціяне такія, што за іх сорамна. Каля Школы бралі шлюб маладыя жыды. Навокал сабралося шмат католікаў і праваслаўных, і пачалі яны здзеквацца з жыдоўскага шлюбу, перашкаджаць шумам чытаць рабіну малітвы. Кожны чалавек паважае сваю веру і хоча, каб яе паважалі іншыя… І чаму яны лічаць сябе хрысціянамі?*[72]

У Воранаве падчас каталіцкага свята аднойчы адбыўся габрэйскі пагром. Справа заключалася ў тым, што ў лютым 1883 г. у Беняконскай воласці было прынята рашэнне аб пераносе ў Воранаве базарнага дня з нядзелі на аўторак. Канфліктная сітуацыя склалася ў Воранаве ў нядзелю 19 чэрвеня 1883 г. падчас каталіцкага царкоўнага свята. У гэты дзень у мястэчку сабралася шмат габрэяў з таварамі. Яны размясцілі свае прылаўкі каля касцёла і чакалі заканчэння набажэнства. Калі забілі званы, габрэі пачалі грукаць сваімі косамі. Гэта выклікала сутычку паміж габрэйскімі гандлярамі і абуранымі іх дзеяннямі сялянамі. Сяляне пачалі перакульваць габрэйскія павозкі з таварамі. Шкода, нанесеная габрэям, склала суму ў 508 руб. Пры разглядзе абставін гэтага здарэння ўлады занялі бок сялян[73].

Часам хрысціяне выкарыстоўвалі на сваю карысць іўдзейскі *Шабат*[74]. Прадэманструем гэта з дапамогай успамінаў Ф. Воінава пра сваё знаходжанне ў Мінскай губерні ў 1865–1866 гг.:

*З гаспадаром, у якога мне давялося пражыць гады паўтара, адбыўся казус. Жыў у яго адзін пан і гуляе пастаянна, запрашаючы да сябе нярэдка старога гаспадара, які любіў часам за гутаркай выпіць шклянку гарбаты з ромам, Гаспадар габрэй, без душы ад такога добрага жыльца. Але пан, бачачы, штоз даўгоў яму не выблытацца, бо аднаму гаспадару запазычыў больш за тысячу рублёў, узяў паштовых коней, ды сто рублёў у таго ж самага гаспадара, і ў ноч з пятніцы на суботу ўцёк. Тут гэта звычайная тактыка даўжнікоў – бегаць ад сваіх крэдытораў з пятніцы на суботу, бо габрэі, дзякуючы свайму талмудычнаму веравучэнню, ні за што не зробяць пагоні за ўцекачом у суботу*[75].

---

[71] Мойхер Сфорим М. История одной жизни… С. 56.
[72] Наша Ніва. 1908. 15 жніўня. № 17.
[73] Staliunas D. Anti-Jewish Disturbances in the North-Western Provinces in the Early 1880s // East European Jewish Affairs. Vol. 34. 2004. № 2. P. 123.
[74] Шабат (у перакладзе з іўрыта Субота) – дзень абавязковага адпачынку, малітваў і вывучэння Святога пісання.
[75] Воинов Ф. Путевые записки: Воспоминания о пребывании в Минской губернии с февраля 1865 по 1 мая 1866 г. Санкт-Петербург, 1891. С. 13.

З паступовым разбурэннем традыцыйнага ладу жыцця пашыралася і *свецкая святочная культура***.** Сапраўдным святам для местачкоўцаў былі тэатральныя прадстаўленні, якія ладзіліся не толькі падчас кірмашоў. У мястэчках арганізоўваліся беларускія, польскія, габрэйскія імпрэзы.

У мястэчках усё часцей адбываліся *беларускія вечарыны* – вечары беларускай нацыянальнай культуры, якія ладзіліся творчай інтэлігенцыяй, студэнтамі, мяшчанамі, сялянамі ў першай чвэрці XX ст. Беларускія вечарыны мелі сінтэтычны характар: у іх праграму ўваходзілі спектаклі, харавыя і сольныя песні, танцы, выступленні чытальнікаў. Пра адну з іх мясцовы карэспандэнт «Нашай Нівы» Мікола Явар паведамляў:

*Беларуская вечарынка ў Радашковічах. 15 жніўня ў тэатральным будынку мейсцовай пажарнай дружыны радашковічане віталі рэдкаго госьця – беларускі тэатр, гэты жывы отклік нашаго національнаго прасьвятленьня. Паплылі са сцэны родные лірычные словы, заплакалі родные сумные песьні. Вясёла і радасна было сядзець у бітком набітай народам залі… На сцэне спачатку прэтстаўлялі нейкую забаўную штуку па расейску, а пасля пашла беларуская камедыя Я.Купалы «Паўлінка»… За іх* (акцёраў. – *І. С.) шчырую і ўмелую ігру публіка шчыра і горача біла ім «брава», вітала і дзякавала, як сваім найраднейшым і наймілейшым сваякам… На сцэну выклікалі і аўтара «Паўлінкі». Посьле «Паўлінкі» сыгралі ешчэ польскую камэдыйку. Як скончылося прэдстаўленьне, пачаліся танцы на залі і працягнуліся чуць не да самай раніцы. Скакалі што хто хацеў, але верх брала лявоніха. Не было б то нашэ! А калі пусьціліся яе ў колькі пар кабеты вясковыя з дзецюкамі – было на што паглядзець! Колькі нестрыманай удаласьці і задорнасьці! Колькі жыцьця!*[76]

Цікава адзначыць, што наведвалі беларускія вечарыны і местачковыя габрэі. Так, факт прыхільнасці мясцовых габрэяў да беларушчыны зафіксаваны ў паведамленні са Смаргоні, змешчаным у № 34 «Нашай Нівы» за 1911 г.:

*17 і 18 жніўня былі два беларускія прадстаўленні. Вельмі складна ігралі артысты… На ўсіх прадстаўленнях было найболей жыдоў, і яны-то так шчыра віталі беларускі тэатр. Як бачым, нашы местачковыя жыды, з каторымі беларусы заўсягды жылі ў добрай згодзе, пачалі разумець іх любоў да ўсяго роднага, і бадай-што ўсялякім «истинным» людзям не надта лёгка будзе сеяць паміж беларусамі нянавісьць да жыдоў*[77].

Пашырэнне беларускага нацыянальна-культурнага руху адбілася і на святкаванні Новага года, якое часта стала спалучацца з беларускімі

[76] Наша Ніва. 1913. 5 верасня. № 34.
[77] Наша Ніва. – 1911 г. – № 34 ад 25 жніўня.

прадстаўленнямі. Так, карэспандэнт *К.* з мястэчка Карэлічы ў адным са студзеньскіх нумароў «Нашай Нівы» 1912 г. паведаміў:

*У адным з акалічных двароў на Новы Год адбылася вечарынка, на каторай былі пастаўлены жывые абразы, декламацiя, музыка і песьні. Предстаўленьне устраівалі самі селяне-беларусы (з двара і вёсак) лікам каля 20 чэлавек. Паўзірацца на предстаўленьне сабралося колькі-дзесят чэлавек з гэтаго і суседніх двароў, з вёсак і з мястэчка. Вечарынка складалася з некалькіх часьцей: уступленьня, чатырох часьцей, предстаўляючых чатыры пары году, і канца* [...]. *Актороў усе вельмі віталі і зусім справядліва, бо ўсе увайшлі у свае ролі, ігралі лепей, чым на пробах, дый, наагул як першае предстаўленьне ігралі дужа добра. Асталося вельмі прыятнае ўраженьне з гэтай вечарынкі, каторым і хачу падзяліцца с тымі, хто такіе рэчы можэ зразумець і адчуць*[78].

Цішка Гартны (Зміцер Жылуновіч) апісваў сустрэчу Новага (1913) года ў яго родным Капылі:

*У нас маладзеж сустрэчала Новы Год. Стрэча была дзіўна адмысловая. Каля 20 хлопцоў і дзеўчат у сьвяточным адзеньні сышліся ў хату к аднаму таварышу сьвядомаму беларусу. А восьмай гадзіне вечэра пачалі гульню. Гулялі у хванты і прысуджалі хлопцоў дэклямаваць, пеяць і жарты гаварыць. Дэклямацыя была ўся беларуская. Паэта Чэрн. гаварыў «Лукаша», Я. Коласа і «Пан і акуляры» А. Паўловіча. Ён сказаў надта добра, ажно ўсе лажыліся са сьмеху і хата трэшчала ад отплескоў. Потым загадывалі зваць на вясельля, як некалі звалі у нашум мястэчку. Потым а дванадцатуй гадзіне, паселі за стол і Цішка сказаў павітаньне Новаму Году, на роднай беларускай мове. Пасьля перэцалаваліся ўсе між собою і пачалі бясёду за якой біліся ў конфэсьці, с крыкам з «Новым Годам!» Далей лятучая почта і харавые песьні. Гульня зацягнулася да чацьвёртай гадзіны ночы і магла зацягнуцца да дня, але раптам найшла паліція і перэпісала ўсіх; горка было разыйсціся… Але павінны былі! Нeяк нудна і крыўдна, што гэткае бязвіннае рэчы нельга зрабіць, як стрэчу Новаго Году. Няўжо-ж паліція баіцца слова «Новы Год»?*[79].

Даволі насычаным выглядае культурнае жыццё мястэчка Мір міжваеннага часу з успамінаў яго жыхароў. Яны распавядаюць пра польскія, габрэйскія і беларускія прадстаўленні. Тут меліся духавы аркестр і драмгурткі, ладзіліся вечарыны і танцы, сюды прыязджалі артысты і асілкі, тут праходзілі агляды і спаборніцтвы пажарных камандаў. Сапраўдным местачковым клубам можна назваць памяшканне мірскай пажарнай варты. Міране ўзгадваюць:

---

[78] Наша Ніва. 1912. 19 студзеня (1 лютага) № 3.
[79] Наша Ніва. 1913. 10 студзеня. № 2.

*Там, дзе была пажарная, там зала вялікая была. Ну дак танцы там былі, усе танцавалі. Габрэі таксама прыходзілі, танцавалі. І габрэечкі. У наш час было шмат танцаў: полька, лявоніха, абэрак, кракавяк, падіспан, а таксама дамскі вальс (дзяўчыны запрашалі хлопцаў). Хлопцы свае ўмелі граць. Хто на балалайцы, хто на гітары. Жыдоў наймалі, яны духавую музыку гралі. Туды буфет габрэй прывозіў*[80].

*Пры пажарнай часці быў драмгурток, прыходзілі, спявалі і танцавалі. Ставілі «Мікітаў лапаць». Былі спецыяльныя брашуркі беларускія з п'есамі. Настаўніца адна гэта арганізоўвала. Ставілі п'есы адну на польскай, другую на беларускай [мове]. Спектаклі паказвалі за адзін вечар два разам. А хто б пайшоў на польскі з нашых?! Можа і пайшлі б, але на нашай [мове] – болей*[81].

*У пажарнай праводзіліся Новы год, Каляды. У Новы год стаяла ёлка. Ставіліся прадстаўленні, у асноўным казкі. Былі для дзяцей канцэрты. Як ёлка і на Міколу давалі падарункі. Бацькі самі куплялі падарункі, а дзецям казалі, што ад Міколы. Прыгожыя касцюмы былі, рабілі з карбованай паперы. Казкі ставілі, вершы расказвалі. Дзеці самі выступалі. Самае лепшае прадстаўленне было на Новы год… Ёлка была высокая, упрыгожвалі яе баляніцамі, лялькамі самаробнымі (галаву куплялі, астатняе самі дараблялі). Анёлаў рабілі, шарыкі. І музыка там грала: гармонік, гітара*[82].

*У доме на Танкавай, 6 праводзілі вечарыны габрэі, весяліліся, спявалі габрэйскія песні…*[83].

Местачковыя жыхары часта ўзгадваюць габрэйскую музычную культуру. Сапраўды, жыццё габрэяў у мястэчках было насычана музыкай. Габрэйская музыка мястэчак прадстаўленая трыма пластамі: літургічнай музычнай традыцыяй – *хазанутам* (музычная творчасць, звязаная з функцыяй *хазана* – габрэйскага кантара, спевака ў сінагозе, які вядзе сінагагальнае набажэнства), побытавай народнай песняй, а таксама клезмерскім музыцыяваннем (*клезмеры* – габрэйскія народныя музыканты, якія гралі ў складзе местачковых ці вандроўных ансамбляў на вяселлях, святочных гуляннях, кірмашах).

Тыповай з'явай жыцця мястэчка быў скрыпач, які сядзеў у пэўным месцы вуліцы ці двара і найграваў праніклівыя мелодыі, якія стваралі важны кампанент гукасферы габрэйскай вуліцы.

Такім чынам, прыведзены своеасаблівы калейдаскоп сюжэтаў поліфанічнай святочнай культуры мястэчак паказвае, што мястэчка было не толькі пераходным этапам паселішча («яшчэ не горад, але ўжо не вёска»), гэта яшчэ і самадастатковай адметнай з'явай грамадскага, пабытовага і

[80] Раманава І., Махоўская І. Мір: гісторыя мястэчка… С. 53.
[81] Тамсама.
[82] Тамсама. С. 54, 55.
[83] Тамсама. С. 56.

культурнага жыцця Беларусі, са сваёй непаўторнай атмасферай, яскравым каларытам мудрых і прыгожых традыцый, у тым ліку і святочных.